# ТАЙНАПІС У САМАПРЭЗЕНТАЦЫІ КНІГАПІСЦАЎ XVI ст.

**А. А. Паршанкоў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск;*
*Alex.par5@yandex.by;*
*нав. кір. – А. І. Груша, д-р гіст. навук, дац.*

Разглядаецца адна з тэндэнцый кірылічнага кнігапісання XVI ст. – выкарыстанне кнігапісцамі тайнапісу, як элемент іх самапрэзентацыі. Робіцца здагадка, што выкарыстанне тайнапісу выклікана не сціпласцю кнігапісцаў, а жаданнем захаваць сваё імя з магчымасцю далейшага малітоўнага памінання чытачамі.

***Ключавыя словы:*** тайнапіс; самапрэзентацыя; кірылічнае кнігапісанне; літарэя; Slavia Ortodoxa.

Выкарыстанне тайнапісу – адна з тэндэнцый у прадстаўленні ўласнага імя кнігапісцамі кірылічных кніг на прасторы Slavia Ortodoxa у XVI ст. Тайнапіс у калафонах кніг XVI ст. ужываецца амаль толькі для таго, каб схаваць імя перапісчыка. Для гэтага часцей выкарыстоўвалася простая літарэя – прынцып тайнапіса, пабудаваны на замене адных літар алфавіта іншымі (сустракаюцца, праўда, варыянты, якія дагэтуль не могуць расшыфраваць спецыялісты). Некаторыя перапісчыкі шыфраваліся з дапамогай шарад. У такім выпадку, літара за літарай (кожная літара – адказ на шараду) можна было ўзнавіць імя перапісчыка тэкста.

Увогуле, тайнапіс ў славянскіх кнігах сустракаецца ўпершыню ў канцы XIV ст. [1, с. 25]. Пры адказе на пытанне, навошта кнігапісцы выкарыстоўваюць тайнапіс менавіта пры напісанні свайго імя, Міхаіл Сперанскі адзначыў, што гэта было выклікана традыцыяй, схільнасцю кнігапісца да пакоры. Быццам бы, кнігапісцы лічылі называць сябе адкрыта не вельмі сціплым і ўдалым рашэннем [1, с. 3].

У цэлым з такім меркаваннем можна было б пагадзіцца, калі б выкарыстанне тайнапісу ў калафонах кірылічных кніг XVI ст. не насіла адзінкавы характар. Пры массавасці такой з’явы можна было б казаць аб сапраўднай традыцыйнай «сціпласці». Усё ж мы маем толькі каля двух дзясяткаў датаваных кніг з выкарыстаннем тайнапісу. Здаецца, што перапісчык з дапамогай тайнапісу хацеў наадварот падкрэсліць сваё імя. Чытач, зацікаўлены таямніцай, быццам бы ўваскрашае імя кнігапісца. Проста напісанае імя не чапляе зрок, а вось літарэя ці складаныя шарады прыцягваюць увагу. Такім чынам, імя ўваскрашаецца з небыцця.

Мэтай жыцця хрысціяніна з’яўляецца неўміручасць. Здаецца, менавіта прага да бяссмерця абумоўлівае выкананне хрысціянінам усіх запаведзяў у спробе бязгрэшнага жыцця. Аднак, якім бы не было жыццё

грэшнага чалавека, вельмі важным у хрысціянскай традыцыі з’яўляецца памінанне ягонай душы. Малітоўная памяць з’яўляецца вельмі надзейным сродкам, каб атрымаць бяссмерце. Малітоўная памяць – узгадванне кнігапісца ў малітвах, дазваляла спадзявацца на станоўчае рашэнне незразумелага і таямнічага Боскага суда.

Менавіта жаданне атрымаць неўміручасць і прымушала, на наш погляд, фіксаваць свае імя ў калафоне. Прамы зварот кнігапісцаў да чытача ў выходных запісах з просьбай маліцца аб іх душы пацвярджае нашу гіпотэзу. Безумоўна, кнігапісцы маглі фіксаваць сваё імя і проста адчуваючы задавальненне ад сваёй працы і з іншымі матывамі.

Больш сціплым варыянтам самапрэзентацыі было б увогуле не ўказваць сваё імя, абмежавацца выкарыстаннем безыменнай формулы «раб Божы», як гэта рабілі шматлікія кнігапісцы. Гэта яшчэ адзін аргумент ў падтрымку нашай думкі.

Паназіраем, як кнігапісцы выкарыстоўваюць магчымасці тайнапісу. Вось як зашыфраваў сваё імя Закхей: «Имя же мое в инокых худаго написавшего книгу сию, аще хощете увѣдати, начало тому есть число седморичное с первым, срѣда же двадесятно и шесть сот с пяторицею, накончевает же ся осморицею» [2, с. 27]. Кнігапісец Васілій прымяняе больш складаны варыянт: «И аще ли хощещи имя сведать писавшаго сеи, тои написую ти и счет обрящеши. Седмь письмен имат и суть от них гласна шесть, и едина счетом последняя, трищи сугубую всего же число есть сторица дващи десятица пятижды, и едина четверицею. И рекше все число и счет сих двѣстѣ и пятьдесят, и четыре» [2, с. 55]. Аўтар Мінеі службовай (1592 г.) шыфруе нейкі тэкст з дапамогай заглаўных літар: «Здѣлана сии Минѣя лѣта 7100-го июня 9 день. МЯКЛИ» [2, с. 360].

Зашыфроўваюцца не толькі імены, а нават прозвішчы. Так зрабіў, напрыклад, Панцялей Іваноў у спісаным ім Службоўніку (1540/1541 г.) [2, с. 164]. Дарэчы, з’яўленне прозвішчаў кнігапісцаў у калафонах таксама адна з новых тэндэнцый: «А писал многогрѣшны[и] раб Божии Жирѣи Иванов сын Бутаков», «…писал…Арсенишко Сахарусов» [2, с. 25]. Канечне, прычынай з’яўлення такой тэндэнцыі стала ўзнікненне прозвішчаў, а не нейкая новая форма самапрэзентацыі. Гэта таксама паказвае, як агульныя тэндэнцыі ўплывалі на самапрэзентацыю кнігапісцаў.

Складаны шыфр прымяняе таямнічы «Оитаихомину» у кнізе Устаў царкоўны (1547 г.): «А писал книгу многрешныи неключимыи раб мл дд ср а іс сс дг кк дд мі срръ» [2, с. 186]. У Апостале-апракасе 1547 г. у зашыфраваным выглядзе нават указваецца паходжанне перапісчыка [2, с. 190]. Такія падрабязнасці сустракаюцца даволі часта.

Іншы раз тэкст-ключ – шарада, вельмі вялікі. Яркім прыкладам з’яўляецца Зборнік слоў Грыгорыя Багаслова (1589/1590 г.). Пры гэтым, зашыфравана там толькі кароткае імя кнігапісца, што здзіўляе нясціпласцю перапісчыка [2, с. 346].

Усё вышэйсказанае дазваляе замацаваць тэзіс аб тым, што кнігапісцы карысталіся тайнапісам не з-за «уяўнай» сціпласці, а наадварот, з-за жадання зафіксаваць на сабе ўвагу. Разнастайнасць зафіксаваных шыфраваных варыянтаў самаідэнтыфікацыі, а не толькі самапрэзентацыі ў цэлым, паказвае на тое, што кнігапісцы чакалі, каб іх шыфр быў прачытаны, а імя ўзгадана.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Сперанский, М. Н.* Тайнопись в юго-славянских и русских памятниках письма / М.Н. Сперанский. – Ленинград : Изд-во Акад. наук СССР, 1929. – 161 с.
2. *Усачев, А. С.* Книгописание в России XVI века: по материалам датированных выходных записей / А.С. Усачев. Т. 2. – Москва; Санкт-Петербург : Альянс-Археео, 2018